Настоящим скачком в медицине во время Первой мировой войны можно считать протезирование. Протезирование конечностей на момент начала войны было на низком уровне: протезы считались неудобными, создавали лишь видимость целостности тела, пациенты в основном отказывались носить их. После окончания войны дизайн протезов включал искусственную насадку на руку, оснащенную раздвоенным крюком, позволявшим брать вещи и выполнять ежедневные задачи. Лучшими считались протезы американской компании Carne Artificial Arm Co, которые поставлялись в армию Великобритании. Протезы получили прозвище «рука офицера», так как позволить их себе мог только высший офицерский состав.

Недостаточная оснащенность армии средствами борьбы с эпидемиями и плохая их реализация военно-медицинской службой приводили к большой смертности. Недостаточное количество бактериологических лабораторий и санитарно-гигиенических отрядов сказывалось на эффективности ранней диагностики инфекционных болезней. Поэтому были введены обязательные прививки против брюшного тифа и холеры, созданы фронтовые лаборатории, использовались походные дезинфекционные камеры. В результате этого в течение войны в русской армии не было крупных вспышек инфекционных заболеваний.

Но на территории оккупированной Беларуси было зафиксировано несколько мелких вспышек. В начале 1918 г. распространяется сыпной тиф, летом – холера. Для санитарно-противоэпидемических мероприятий использовались имевшиеся силы и средства (санитарно-дезинфекционный отряд, санитарно-бактериологическая лаборатория, вокзальный обсервационный пункт, пункты холерных прививок, бюро очистки и дезинфекции, развернутые койки для острозаразных больных в городской больнице, двух госпиталях, холерных бараках, изоляционной квартире; выдались бесплатные талоны на стрижку, помывку).

## СПИСОК ЛИТЕРАТУРЫ


1. Вилижинская, К. А. Достижения медицины в годы Первой мировой войны / К. А. Вилижинская, Исакова Э.; руководитель В. В. Суворов // Conferences' Archive » V Всероссийская неделя науки с международным участием, Week of Russian science (WeRuS-2016), посвященная «Всемирному дню здоровья». Электронный сборник материалов конференции. – Режим доступа: https://medconfer.com/node/5963. – Дата доступа: 15.10.2017.
2. Заблудовский, П. Е История медицины: методическое пособие / П. Е. Заблудовский – М.: Медицина, 1998. – 242 с.
3. Украинский, А. Ю. От прокладки до пластической хирургии. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://rusplt.ru/ww1/history/ot-prokladok-do-plasticheskoy-hirurgii-14501.html. – Дата доступа: 17.10.2017.



**САВІЧ А. А.**
Брэсцкій дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна
г. Брэст, Рэспубліка Беларусь


## ЗАКАНЧЭННЕ ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ І ЎСТАЛЯВАННЕ ПОЛЬСКАЙ УЛАДЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Рыжская мірная дамова ад 18 сакавіка 1921 г., якая падвяла рысу пад польска-савецкай вайной, несумненна з'яўляецца адной з ключавых падзей у гісторыі Беларусі XX стагоддзя, якая сваёй ёмістай перадгісторыяй, ходам перамоў, сутнасцю і наступствамі на доўгія гады перадвызначыла дзяржаўна-палітычныя, палітыка-дыпламатычныя, этнакультурныя працэсы ва Усходняй Еўропе, абумоўліваючы сваім красамоўным дэтэрмінізмам як адзінкавыя, лакальныя, так і буйнамаштабныя міжнародныя падзеі. Рыжскі мір, заключаны без уліку беларускіх інтарэсаў і ў адсутнасці паўнавартасных беларускіх прадстаўнікоў, у сістэме тагачасных гістарычных падзей,

Репозиторий БрГТУ

апрача афармлення адпаведных бакоў польска-савецкіх адносін і фарміравання геапалітычнай структуры Усходняй Еўропы, перадвызначыў, у прыватнасці, становішча Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. як часткі міжваеннай Польшчы [1]. У разуменні значэння Рыжскага міру ў дачыненні да Заходняй Беларусі вялікае значэнне мае гістарыяграфічнае асэнсаванне тэмы, якое дагэтуль не атрымала свайго выяўлення.

Дынаміка адносін да Рыжскага міру з боку айчынных аўтараў характарызуецца натуральнай цікавасцю да падзеі і абурэннем несправядлівымі наступствамі дамовы ў дачыненні да Беларусі ў перыядычным друку Беларусі і Савецкай Расіі ў першай палове 1920-х гадоў з наступным замоўчваннем і канстатацыяй польска-савецкага замірэння як з'явы, што стала вынікам польскай экспансіі і падставай для захопу Польшчай этнічных беларускіх зямель. Такога кшталту абмежаваныя фармулёўкі існавалі ў айчыннай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі ажно да ўсталявання незалежнай суверэннай Рэспублікі Беларусь. Цікава, што ў адрозненні ад Савецкай Расіі, у Польшчы ўжо 18 чэрвеня 1921 г. у афіцыйным выданні быў апублікаваны поўны тэкст Рыжскай дамовы на трох мовах з пяццю дадаткамі, закон аб ратыфікацыі і пратакол абмену ратыфікацыйнымі дакументамі [2, 3, 4].

Хуткія водгукі з боку беларускай грамадскасці ў дачыненні да перамоваў у Рызе і яго вынікаў былі негатыўнымі і эмацыйнымі, сваёй танальнасцю кансалідуючыся з рашэннямі Пражскай канферэнцыі беларускіх дзеячаў 1921 г. На прыкладзе “Беларускіх ведамасцей” можна праілюстраваць, як аўтары публіцыстычных матэрыялаў рэзка асуджалі імперскія амбіцыі суб'ектаў перамоў, якія за кошт этнічных беларускіх зямель уладкоўвалі свае геапалітычныя спрэчкі: “Беларусь падзелена, зруйнована, і над ёю робіцца самая брыдкая практыка чорнай – прачорнай палітыкі, якой яна ня бачыла яшчэ ніколі” [5, 6].

На фоне гэтага сёння цікава адзначыць меркаванне і апанентаў беларуска-эсэраўскай ідэалогіі, у прыватнасці В. Кнорына, аднаго з непасрэдных распрацоўшчыкаў ідэалагічных установак аб варожасці “беларускага буржуазнага нацыяналізму”. У 1924 г. ён у цэлым кансалідаваўся з думкай аб несправядлівым характары польска-савецкага замірэння ў дачыненні да Беларусі: “Граница, установленная рижским миром 1921 г., проходит по живому телу белорусского народа”. Аздабляючы сваё стаўленне вядомымі ідэалагемамі, В. Кнорын пераконваў, што адзначаная несправядлівасць зыходзіла ад Польшчы, якая захапіла беларускія землі і праводзіла там дыскрымінацыйна-абмежавальную ў дачыненні да мясцовага насельніцтва палітыку, у той час як жыхары БССР “имеют все возможности национального культурного строительства в интересах шир трудящихся масс” [7].

Яскравым прыкладам высокага патрыятычнага хвалявання і рэзкай нязгоды з Рыжскім мірам стала творчасць беларускіх паэтаў, у першую чаргу Янкі Купалы і Якуба Коласа [8; 9; 10]. Беларускі гісторык і літаратуразнаўца А. Трафімчык адзначыў, што “адразу пасля падзелу беларускія паэты выказваліся вельмі востра супраць брутальнага стасоўна Беларусі акта”, аднак “пацІху тая вастрыня патухае” [10, с. 282]. Аналагічную дынаміку стаўлення да рыжскіх пагадненняў дэманстравалі і навукоўцы, стаўленне і акцэнты якіх дэманструюць падобныя змены. Пад ціскам розных цэнзурных інстанцый публікацыі паступова пазбаўляліся асуджальна-негатыўных фармулёвак, атрымліваючы апалітычна-канстатацыйныя рысы. Так, беларускі вучоны і нацыянальны дзеяч А. Смоліч першапачаткова даволі рэзка адрэагаваў на Рыжскі мір, лічыў, што “такі *палітычны падзел Беларусі не абапіраецца ні на якія геаграфічныя асновы. Межы праведзены па жывому целу Беларусі*” [11, *с. 7*]. У 1925 г. А. Смоліч, перакананы прыхільнік беларускіх нацыянальна-дзяржаўных прыярытэтаў, прытупіў вастрыню антырыжскай рыторыкі, у духу афіцыйнай савецкай ідэалогіі звярнуў увагу на выхадкі міжнароднай буржуазіі і штучнасць аддзялення заходняй часткі Беларусі ад цэнтральнай і ўсходняй [12, с. 7, 267].

Так паступовае фарміраванне навуковага аблічча аповядаў пра рыжскія дамовы і становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы пачало замоўчваць складанасць і шматаспектнасць праблемы, прымітывізуючы яе выкладанне да надзвычай спрошчаных схем, якія апраўдвалі правальную для Савецкай Расіі фінальную фазу польска-савецкай вайны і канстатавалі адыход Заходняй Беларусі да Польшчы па выніках дамовы.



Репозиторий БрГТУ

Відавочна, што беларускія аўтары павінны былі суадносіць свае адносіны да Рыжскага міру і яго наступстваў з агульнасавецкай гістарыяграфічнай схемай аб больш выгадных для Савецкай Расіі ўмовах у параўнанні з умовамі вясны 1920 г. і імперыялістычным характары міру з боку Польшчы [13, с. 89]. У гэтым кантэксце адзначым і вядучага міжваеннага айчыннага гісторыка Рыжскага міру У. Пічэту, які дастаткова шматаспектна і абектыўна падае гісторыю падрыхтоўкі і падпісання Рыжскага міру [14–16]. У прыватнасці, у дачыненні да магчымых варыянтаў пасляваеннага ўладкавання Заходняй Беларусі польскімі ўладамі У. Пічэта згадаў рознаскіраваныя палітычныя праекты прыхільнікаў розных палітычных накірункаў Польшчы, значным чынам паглыбляючы ўяўленні пра характар і альтэрнатыву перспектыў польскай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі [16, с. 85–87].

Адзначаючы агульную скіраванасць айчыннай савецкай гістарыяграфіі на захопніцкую сутнасць Польшчы, акупацыйны, асіміляцыйны, дыскрымінацыйны характар польскай палітыкі ў Заходняй Беларусі, трэба мець на ўвазе, што гэтыя фармулёўкі выклікалі крыўду і асуджэнне польскіх камуністаў, якія намагаліся канчаткова замацаваць "крэсы" за Польшчай і для якіх Рыжскі мір успрымаўся як законная падстава ўваходжання краю ў склад Польшчы. "Оккупации никакой нет, а трактат есть трактат" (тут і далей арфаграфія, стыль і падкрэсліванне крыніцы. – А.С.) [17, арк. 4]. Такая пазіцыя падводзіла камуністычны рух у Заходняй Беларусі да расколу, які і выявіўся восенню 1925 г. у выглядзе беларускай фракцыі ў КПЗБ т. зв. "сэцэсіі" [18]. Аднак яшчэ ў 1921 г. беларускіх камуністаў турбавала сітуацыя, калі ім прыходзілася сумесна наладжваць антыакупацыйную барацьбу "на крэсах" з тымі, якія лічылі, што ніякай акупацыі Польшчай Заходняй Беларусі няма [17, арк. 4–5].

Прынцыпова трэба адзначыць, што ўнутрыпартыйныя спрэчкі адносна падстаў і характару польскай улады і асабліва пытанні характару і рухаючых сіл рэвалюцыйнай барацьбы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўплывалі на асвятленне рыжскіх пагадненняў і становішча беларускіх зямель у складзе Польшчы. Функцыянеры КПП, складовай часткай якой без уласнага статуту, а не самастойнай партыяй, была КПЗБ, і прапольскія кіраўнікі КПЗБ патрабавалі, каб у публікацыях па заходнебеларускай праблематыцы БССР мэтанакіравана змяншалася акупацыйна-захопніцкая рыторыка. Выяўленым прыкладам такога гістарыяграфічнага дэтэрмінізму стала гісторыя зборніка артыкулаў па Заходняй Беларусі [19], названага прапольска арыентаванай "меншасцю" КПЗБ начале з А. Максімоўскім "фракцыйным зборнікам" [20, арк. 46–51].

Пытанне Рыжскага міру і яго наступстваў пасля пэўнага часу інтэнсіўнага абмеркавання як вузлавой знешнепалітычнай праблемы Савецкай Расіі і ў вышэйшых бальшавіцка-камінтэрнаўскіх колах адышло на задні план, што разам з адміністратыўна-цэнзурнымі і рэпрэсіўнымі спосабамі ўздзеяння на аўтараў публікацый вяло да звужэння адпаведнай тэматыкі. У прыватнасці У. Пічэта ў канцы 1930-х гадоў значна спрасціў свае разважанні пра Рыжскі мір, абмежаваўшыся кароткай, але палітычна вытрыманай фармулёўкай з відавочнымі недакладнасцямі, якія, магчыма, тлумачацца яго фактычнай адасобленасцю ад сапраўднай гістарычнай працы [21, с. 120].

Прымітывізацыя і схематызацыя як сродак пабудовы класічнай савецкай схемы рыжскіх пагадненняў у дачыненні за Заходняй Беларусі выяўляецца ў знакамітым творы, прысвечаным У. Леніну і І. Сталіну: "Польшча, не маючы сіл прадоўжыць вайну, аказалася вымушанай адмовіцца ад сваіх планаў захопу правабярэжнай Украіны і Беларусі і паправісла міру. 20 кастрычніка 1920 г. у Рыге быў заключан мірны дагавор. Па гэтаму дагавору Польшча ўтрымала за сабой Заходнюю Украіну і заходнюю частку Беларусі. З таго часу аж да 1939 г. Заходняя Беларусь знаходзілася пад прыгнётам польскіх паноў" [22, с. 82].

Актывізацыя гістарыяграфіі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. пасля XX з'езда КПСС і да пачатку 1990-х гадоў [1, с. 45–83] не адбілася спрыяльна на падачы Рыжскага міру і яго наступстваў для Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Прычынай гэтага верагодна з'яўлялася нежаданне партыйна-дзяржаўных куратараў беларускай гістарычнай навукі выяўляць сапраўднае аблічча савецкай знешняй палітыкі і

Репозиторий БрГТУ

дыпламатыі, кіраўнікі якіх не хацелі азмрочваць адносіны паміж СССР і Польшчай. У гэтым плане характэрнымі, красамоўнымі і адначасова цынічнымі з'яўляюцца тыповыя заўвагі М. С. Арэхвы ў дачыненні, па яго меркаванні, да непажаданых выказванняў С. А. Ваўпшасава: "Нельзя не из-за Народной Польши, теперешние руководители которой, в прошлом члены Компартии Польши, это занют, а из-за сегодня существующего капиталистического окружения... Это был вопрос отношения между государствами, находившимися в состоянии войны, и подымать этого сейчас не стоит… Возвращаться сейчас к польским зверствам в период польско-советской войны, по высказанным мною выше соображениям, не следует" [23, арк. 13, 15, 16]. Не дзіўна, што ў выданнях другой паловы 1960-х – 1980-х гадоў тэма Рыжскага міру у кантэксце гісторыі Заходняй Беларусі не атрымала паглыблення, дакладна дэманструючы элементы гістарыяграфічнай канструкцыі папярэдняга перыяду [24, 25, 26].

Незалежнасць і ўмацаванне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь сталі вызначальнай ўмовай удасканалення айчыннай гістарычнай навукі ў цэлым і паўнавартаснага навуковага асэнсавання гісторыі Рыжскага міру і яго наступстваў у прыватнасці. Як трапна выказаўся У. М. Міхнюк, "прыйшоў час паглядзець на Рыжскі мір не толькі з Варшавы і Масквы, Вільні і Кіева, але і з Мінска" [27, с. 137]. Паглыбленню і аб'ектывізацыі навуковага асэнсавання рыжскіх пагадненняў спрыялі міжнародныя навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя праблемам міжнародных адносін, а ў першую чаргу 80- і 90-годдзю падпісання Рыжскага міру [28; 29]. Адпаведны працэс атрымаў увасабленне ў вялікай колькасці грунтоўных навуковых прац, у якіх на падставе прыярытэтаў беларускай нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі прэзентаваны шматлікія аспекты гісторыі падрыхтоўкі, падпісання і выканання Рыжскага міру, што забяспечвае больш якасны ўзровень інтэпрэтацыі становішча Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы [30, 31, 32, 33, 34, 35, 36].

Навуковыя дасягненні аўтараў прыведзеных публікацый былі выкарыстаны ў калектыўнай манаграфіі "Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. В 2 кн." [37]. Узважаны канцэптуальны падыход выдання характарызуецца больш грунтоўным навуковым і глыбокім гістарыясофскім асэнсаваннем рыжскіх пагадненняў як рубежнага пачатку новай геапалітычнай архітэктуры Усходняй Еўропы, а адпаведныя падзеі падаюцца як падставы для глабальных змен міжнароднага ваенна-палітычнага стану, у тым ліку 1939–1945 гг. У дачыненні да Заходняй Беларусі выданне справядліва выдзяляе два асноўныя аспекты, звязаныя з прызнаннем нацыянальных правоў беларусаў Польшчай і абавязкамі па іх абароне і несправядлівым гвалтоўным падзелам тэрыторыі Беларусі [37, с. 190], як асноватворныя падставы нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў 1921–1939 гг.

Такім чынам, гістарыяграфічнае асэнсаванне Рыжскага міру ў кантэксце гісторыі Заходняй Беларусі выяўляе відавочную абумоўленасць вывучэння і асвятлення ў друку гэтай важнай падзеі ідэйна-палітычнымі прыярытэтамі савецкага партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва. З'яўляючыся часткай савецкай партыйна-дзяржаўнай ідэалогіі, беларуская гістарычная навука не магла аб'ектыўна адлюстроўваць падзеі Рыжскага міру як прававой падставы знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы. Беларускія аўтары вымушаны былі прыслухоўвацца да патрабаванняў партыйных ідэолагаў, хаваць вострыя і непрыемныя для беларусаў бакі рыжскіх пагадненняў, звязаных з ігнараваннем інтарэсаў Беларусі. У выніку тэрытарыяльных саступак за кошт беларускіх зямель, савецкае кіраўніцтва выгандлявала патрэбныя для іх пазіцыі ўзаемадачыненняў з Польшчай, у наступным, у тым ліку ў інтарэсах польскай улады, павяло курс на схематызацыю Рыжскага міру, замоўчванне ў дачненні да Беларусі акупацыйна-дыскрымінацыйнай сутнасці знешняй палітыкі Польшчы і Савецкай Расіі. Гэтая тэндэнцыя прасочвалася да пачатку 1990-х гадоў да моманту ўтварэння Рэспублікі Беларусь, незалежнасць якой стварыла спрыяльныя ўмовы для аб'ектыўнай навуковай рэканструкцыі і адэкватнай інтэрпрэтацыі Рыжскага міру ў кантэксце гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.



Репозиторий БрГТУ

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2012. – 288 с.
2. Ustawa z dnia 15 kwietnia 1921 roku o ratyfikacji Traktatu pokoju między Polską a Rosją i Ukrainą, podpisanego w Rydze dnia 18 marca 1921 roku // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1921. – № 49. – S. 813.
3. Traktat pokoju między Polską a Rosją i Ukrainą, podpisany w Rydze dnia 18 marca 1921 roku // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1921. – № 49. – S. 814–867.
4. Protokuł wymiany dokumentów ratyfikacyjnych // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1921. – № 49. – S. 867.
5. Зьезд у Празе // Беларускія ведамасьці. – 1921. – № 1 (14 верасьня).
6. Русіфікайцыя ў Усходняй Беларусі // Беларускія ведамасьці. – 1921. – № 7 (24 кастр.).
7. Кнорин, В. Современное положение в Западной Белоруссии // Звезда. – 1924. – № 61. – 14.03. – С. 5.
8. Лазько, Р. Польска-савецкія мірныя перамовы і лёс Беларусі / Р. Лазько // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 12. – С. 5.
9. Трафімчык, А. Хто чужаніцы? Якуб Колас пра падзел Беларусі 1921 года / А. Трафімчык // Дзеяслоў. — 2012. – № 5 (60). – С. 279–292.
10. Трафімчык, А. “Раз абсеклі Беларуса Маскалі ды Ляхі…” Падзел Беларусі 1921 г. у паэтычным асэнсаванні Янкі Купалы / А. Трафімчык // Дзеяслоў. – № 2 (57). – С. 275–294.
11. Аркадзь Смоліч. Географія Беларусі. Выданьне 3-е, значна перарobленае і дапоўненае, з 159 рысункамі і картамі / А. Смоліч. – Вільня : “Віленскае выдавецтва” Б.А. Клецкіна. Беларускі аддзел, 1923. – 367 с.
12. Смоліч, Аркадзь. Кароткі курс географіі Беларусі / А. Смоліч. – Менск : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1925. – 352 с.
13. Мезга, Н. Н. Между наукой и политикой: советско-польские отношения в историографии России и Польши 1918–1941 годов / Н. Н. Мезга ; М-во образования РБ, Гом. гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2014. – 236 с.
14. Пічэта, У. Польска-савецкія адносіны і Рыжскі мір / У. Пічэта // Полымя. – 1928. – № 4. – С. 147–166.
15. Пічэта, У. Польска-савецкія адносіны і Рыжскі мір / У. Пічэта // Полымя. – 1928. – № 5. – С. 83–100.
16. Пічэта, У. Польска-савецкія адносіны і Рыжскі мір / У. Пічэта // Полымя. – 1928. – № 6. – С. 126–147.
17. Российский государственный архив социально-политической истории (РГАСПИ). – Ф. 495. – О. 129. – Д. 71.
18. Савіч, А.А. “Сэцэсія” ў КПЗБ у айчыннай гістарыяграфіі / А.А. Савіч // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя гуманітарных і грамадскіх навук. Філасофія і логіка. Гісторыя. Псіхалогія. Права. Педагогіка. – 2007. – № 3(30). – С. 23–31.
19. Западная Белоруссия : сб. статей. – Менск : Белорус. гос. изд-во, 1927. – Кн. 1. – 211 с.
20. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. – Воп. 2. – Спр. 132.
21. Основные моменты исторического развития Западной Украины и Западной Белоруссии / В. И. Пичета. – Москва : Государственное социально-экономическое издательство, 1940. – 136 с.
22. В. І. Ленін і І. В. Сталін – арганізатары Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі / Е. Карнейчык, Ф. Папоў, М. Шкляр; пад рэд. І. Чымбурга. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1949. – 228 с.
23. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1103.
24. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.] ; под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. – Минск : Беларусь, 1966. – 403 с.


Репозиторий БрГТУ

25. Мацко, А. Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918–1939) / А. Н. Мацко. – Минск : Беларусь, 1972. – 335 с.
26. Полуян, В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В. А. Полуян. – Минск : Наука и техника, 1978. – 359 с.
27. Міхнюк, У. Рыжскі мір і Беларусь / У. Міхнюк // XX стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў : матэрыялы беларус.-польск. навук. канф., Мінск, 20–21 ліст. 2000 г. / Адк. рэд.: У. Міхнюк, П. Гарнцарэк. – Мінск : БДУ, 2001. – С. 137–145.
28. Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і лёсы народаў Усходняй Еўропы: Матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф. (Мінск, 16–17 сакавіка 2001 г.) / Пад навук. рэд. У. Ф. Ладысева. – Мінск : БДУ, 2001. – 210 с.
29. Да 90-годдзя прыняцця Рыжскага дагавору 1921 г. Матэрыялы з гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у XX ст. W dziewięćdziesiątą rocznicę traktatu ryskiego 1921 r. Studia z dziejów stosunków polsko-białoruskich w XX w.: зборнік навуковых прац III Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Мінск, 9–10 чэрвеня 2011 г. / [укладанне, навуковыя рэдактары: Е. Расоўская, А. Вялікі]. – Мінск : Ковчег, 2011. – 343 с.
30. Мезга, М. Мяжа канфрантацыі (становішча Заходняй Беларусі пасля падпісання Рыжскай дамовы 1921 г.) / М. Мезга // Беларус. мінуўшчына. – 1996. – № 2. – С. 29–31.
31. Ціхаміраў, А. В. Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921) / А. В. Ціхаміраў. – Мінск : Экаперспектыва, 2003. – 400 с.
32. Ладысеў, У. Рыжскі мірны дагавор: перамога савецкай дыпламатыі ці паражэнне? / У. Ладысеў // Беларус. гіст. часоп. – 2001. – № 3. – С. 23–27.
33. Лазько, Р. Польска-савецкія мірныя перамовы і лёс Беларусі / Р. Лазько // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 12. – С. 5–12.
34. Лазько, Р. Перад патопам (Еўрапейская палітыка Польшчы. 1932–1939 гг.) / Р. Лазько. – Мінск : БДУ, 2000. – 354 с.
35. Снапкоўскі, У. Знешнепалітычная дзейнасць Беларускай ССР (1919–1929 гг.) / У. Снапкоўскі // Беларус. гіст. часоп. – 2001. – № 3. – С. 28–41. Бароўская, В. М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В. М. Бароўская. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 269 с.
36. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.: в 2 кн. / НАН Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2014. – Кн. 1 – 593 с.

Репозиторий БрГТУ